# *§ 32–33–0. Асноўныя тэндэнцыі палітычнага развіцця цывілізацый свету ў XVI–XVIII стст.

**1. Рысы феадальнай арганізацыі ўлады.** У XVI–XVIII стст. у краінах Еўропы і тым больш Усходу захоўвалася шмат элементаў феадальнай арганізацыі ўлады, хоць агульнай тэндэнцыяй быў паступовы пераход да больш цэнтралізаваных формаў праўлення, асабліва ў краінах Еўропы. Пры феадальнай арганізацыі ўлады выразна праяўляюцца палітычная раздробленасць і дэцэнтралізацыя. Яскравым прыкладам можа служыць Свяшчэнная Рымская імперыя, дзе імператар меў абмежаваныя паўнамоцтвы, а князі, герцагі і арцыбіскупы фактычна былі незалежныя. На Усходзе аналагічная сітуацыя назіралася ў Японіі перыяду сёгунату Такугава. Фармальна краінай кіраваў імператар, але рэальная ўлада належала сёгуну і князям (даймё), якія захоўвалі аўтаномію. У Асманскай імперыі таксама існавала сістэма зямельных падараванняў (тымар). Феадалы (сіпахі) атрымлівалі права збіраць падаткі з сялян у абмен на службу султану.

У феадальную эпоху грамадства будавалася на аснове іерархіі і асабістай адданасці. У некаторых краінах Еўропы, напрыклад у Францыі або Англіі, феадальныя іерархічныя сувязі ў Новы час пачалі слабнуць, аднак у іншых рэгіёнах (асабліва ва Усходняй Еўропе і Азіі) яны захоўваліся аж да канца XVIII ст. і нават пазней. Падобныя ж адносіны існавалі ў Індыі ў эпоху праўлення Вялікіх Маголаў. Тут імперская адміністрацыя раздавала вайскоўцам і чыноўнікам часовыя зямельныя падараванні (джагіры) з правам збіраць даход. Джагірдар (уладальнік падаравання) абавязаны быў пастаўляць воінаў шаху ў выпадку ваеннай неабходнасці.

Вайсковая служба была галоўным абавязкам феадала. Зямля давалася яму не проста за службу, а за

гатоўнасць выставіць пэўную колькасць воінаў на патрабаванне свайго пана. Так, у Японіі вайсковая знаць (самураі) была звязаная з феадаламі-даймё, а ў Індыі джагірдары мусілі выстаўляць войскі ў распараджэнне імператара. Нават у Асманскай імперыі аснова войска — кавалерыя сіпахаў — фарміравалася паводле феадальнага прынцыпу.

## ПРАВОДЗІМ МІНІ-ДАСЛЕДАВАННЕ

Пра мужнасць самураяў і іх адданасць свайму гаспадару вядома нямала гісторый. Адна з іх — пра 47 ронінаў — захавалася да нашых дзён дзякуючы японскаму народнаму паданню.

1. *Каго называюць ронінам? Дайце вызначэнне паняцця, даведаўшыся яго даслоўны пераклад.*
2. *Даведайцеся пра гісторыю 47 ронінаў. Пры магчымасці прадстаўце яе ў форме манга (японскага комікса).*
3. *Якім чынам існаванне ронінаў дэманструе строгія сеньёрыяльна-васальныя адносіны ў японскім грамадстве эпохі Такугава?*
4. *Пра якую рысу менталітэту японскага народа сведчыць досыць доўгае існаванне самурайскага саслоўя?*

У самурайскім грамадстве манарх часцяком не меў усёй паўнаты ўлады. Ён павінен быў лічыцца з меркаваннем знаці, а часам і сходу саслоўяў. Манарх не мог без падтрымкі дваранства непасрэдна кіраваць усёй краінай, збіраць падатак або весці вайну. Нават ва ўмовах абсалютызму (напрыклад, у Францыі пры Людовіку XIV) кароль павінен быў улічваць інтарэсы арыстакратыі. На Усходзе абсалютная ўлада султана або падышаха часта спалучалася з моцным уплывам мясцовых феадалаў. У Кітаі эпохі Мін і Цын фармальна ўлада была цэнтралізаваная, але на практыцы імператары абапіраліся на сістэму спадчынных землеўладальнікаў і чыноўнікаў, якія перадавалі свае пазіцыі ў спадчыну і мелі значны ўплыў у правінцыях.

Феадальная ўлада не мела развітой сістэмы кіравання. Цэнтральныя органы не маглі наўпрост кантраляваць велізарныя тэрыторыі, таму праўленне ажыццяўлялася праз мясцовых феадалаў. У эканоміцы пераважала натуральная гаспадарка, грашовыя адносіны развіваліся марудна, асабліва ў аграрных краінах Усходу. Напрыклад, у Асманскай імперыі адбывалася паступовае аслабленне цэнтральнага кантролю: сіпахская сістэма слабла, а правінцыйныя намеснікі рабіліся фактычна незалежнымі. З аслабленнем цэнтральнай улады паўставалі напаўнезалежныя княствы і ў Індыі. Больш за тое, ад канца XVII ст. пачаўся распад імперыі Вялікіх Маголаў, што прывяло да ўзмацнення рэгіянальных княстваў і ўварвання замежных дзяржаў, перш за ўсё брытанцаў.

## РЫСЫ ФЕАДАЛЬНАЙ АРГАНІЗАЦЫІ ЎЛАДЫ

| | | |
|---|---|---|
| палітычная раздробленасць і дэцэнтралізацыя | сеньёрыяльна-васальныя адносіны | абмежаванасць улады манарха |
| слабае развіццё адміністрацыйнай сістэмы | воінскі абавязак як аснова ўлады | натуральны характар эканомікі |

Абапіраючыся на згаданыя рысы феадальнай арганізацыі ўлады, дакажыце, што ў эпоху ранняга Новага часу феадалізм аджываў у Еўропе і захоўваўся на Усходзе.

**2. «Пераноc» рэвалюцыйных пераўтварэнняў на суседнія дзяржавы.** У XVI–XVIII стст. буржуазныя рэвалюцыі ў Еўропе і Амерыцы не абмяжоўваліся сваімі краінамі. Новыя ідэі пераадольвалі межы і натхнялі народы суседніх дзяржаў на ўласныя перамены. Шляхі пашырэння рэвалюцыйных ідэй і пераўтварэнняў

разнастайныя, аднак перш за ўсё гэта было друкаванае слова: кнігі, трактаты, памфлеты. Працы Дж. Лока, Ж.-Ж. Русо, Т. Джэферсана і іншых мысляроў Асветніцтва перакладаліся на розныя мовы, часта абмяркоўваліся ў салонах, універсітэтах і прыватных бібліятэках, дзе сустракаліся філосафы, пісьменнікі і іншыя цікавыя, адукаваныя людзі.



*Чытанне «Трагедыі пра Чынгісхана і яго сыноў» Вальтэра ў салоне мадам Жафрэн. Мастак А. Леманье. 1812 г.*

На карціне выяўлены парыжскі салон сярэдзіны XVIII ст. Мастак паказаў сход інтэлектуалаў, вучоных і грамадскіх дзеячаў французскага грамадства таго часу, сярод якіх Русо, Мантэск'ё. Вальтэр жа, чый твор слухаюць запрошаныя, паказаны ў выглядзе бюста. Падбор персанажаў аўтарам карціны носіць фантазійны, вобразны характар, бо ў такім складзе салон ніколі не збіраў такіх выбітных гасцей.

Важным каналам перадачы палітычнай інфармацыі выступалі дыпламаты і палітэмігранты, выгнаннікі. Удзельнікі рэвалюцый часцяком пакідалі радзіму, рабіліся на чужыне настаўнікамі, ваеннымі інструктарамі або нават саветнікамі пры дварах. Немалую ролю адыгрываў таксама марскі гандаль. Куп-

цы і маракі выступалі як важныя крыніцы інфармацыі пра бягучыя падзеі, а партовыя гарады (Амстэрдам, Лондан, Марсель, Філадэльфія) рабіліся цэнтрамі палітычнай інфармацыі.

Нельга не адзначыць і той факт, што дзяржавы, зацікаўленыя ў аслабленні канкурэнтаў, аказвалі падтрымку ўдзельнікам рэвалюцый. Так, напрыклад, каралеўская Францыя дапамагала амерыканскім каланістам у іх барацьбе супраць Англіі, а пазней рэвалюцыйны Парыж спадзяваўся пашырыць свае ідэі на Італію і Германію.

Першая буржуазная рэвалюцыя — *Нідэрландская* — уяўляла сабой барацьбу супраць іспанскага панавання. Яна натхніла шатландскіх і англійскіх прыхільнікаў парламенцкіх рэформаў. Пасля абвяшчэння незалежнасці Нідэрландаў у 1581 г. у Лондане абмяркоўвалі пытанне пра стварэнне парламента з абмежаваннем паўнамоцтваў караля. Прыклад рэспубліканскага кіравання і рэлігійнай цярпімасці ў Нідэрландах выступаў мадэллю для наступных пакаленняў у Вялікабрытаніі і Германіі.

У сваю чаргу, *Англійская буржуазная рэвалюцыя* і ўсталяванне на кароткі перыяд рэспублікі пад кіраўніцтвам Алівера Кромвеля выклікалі зацікаўленасць у Фландрыі і гарадах Паўночнай Італіі. Мясцовыя гільдыі і гараджане пачалі патрабаваць удзелу ў кіраванні. Англійскі досвед абмежавання манархіі парламентам аказаў моцны ўплыў на палітычную думку Еўропы. «Слаўная рэвалюцыя» ў Англіі замацавала прынцып канстытуцыйнай манархіі і заканадаўчы суверэнітэт парламента. Яе прыклад паслужыў сігналам для іншых краін: шведскія рэфарматары і польская шляхта пачалі разглядаць парламент як інструмент абмежавання ўлады караля.

*Амерыканская рэвалюцыя* прадэманстравала, што калоніі могуць дабівацца незалежнасці і будаваць дэмакратычныя інстытуты. Яе поспех натхніў Францыю, дзе неўзабаве пачалася рэвалюцыя ў імя ідэі

Успомніце імя выхадца з беларускіх зямель, які актыўна паўдзельнічаў у асобных рэвалюцыйных падзеях Еўропы і Амерыкі другой паловы XVIII ст. З якімі краінамі звязаны яго жыццё і гістарычная дзейнасць?

свабоды, роўнасці і народнага суверэнітэту, а таксама выклікаў зацікаўленасць у Іспаніі, Партугаліі і італьянскіх дзяржавах. *Французская рэвалюцыя* зрабілася эпіцэнтрам магутнага рэвалюцыйнага ўплыву. Штурм Бастыліі як сімвала старога рэжыму, Дэкларацыя правоў чалавека і грамадзяніна, стварэнне рэспублікі ў Францыі натхнілі рэспубліканскія клубы ў Папскай вобласці, рэвалюцыйныя таварыствы ў германскіх княствах і італьянскіх гарадах, асабліва ў Таскане і Ламбардыі. Лозунгі «Свабода, Роўнасць, Братэрства» разышліся па ўсёй Еўропе. Рэвалюцыйныя войскі Францыі неслі з сабой не толькі заваёвы, але і рэформы: ад адмены феадальных павіннасцей да ўвядзення грамадзянскага заканадаўства.

## ГІСТОРЫЯ І СУЧАСНАСЦЬ

Буржуазныя рэвалюцыі ранняга Новага часу паклалі пачатак сучаснай класіфікацыі палітычных партый і ідэалогій. Кансерватары і лібералы, «левыя» і «правыя» — тэрміны, што паўсталі ў XVII–XVIII стст.

1. *Суаднясіце паходжанне названых тэрмінаў з канкрэтнымі гістарычнымі падзеямі, апішыце ўмовы іх узнікнення.*
2. *Якія з «заваёў» рэвалюцый ранняга Новага часу захаваліся ў краінах дагэтуль?*

Такім чынам, буржуазныя рэвалюцыі ў Еўропе і Амерыцы былі не толькі паваротнымі момантамі ў гісторыі асобных дзяржаў, але і крыніцай транснацыянальных змен. Ідэі свабоды, народнага суверэнітэту, правоў чалавека і абмежавання манархічнай улады актыўна пашыраліся за межы краін — ініцыятараў рэвалюцый, аказвалі глыбокі ўплыў на палітычнае развіццё суседніх рэгіёнаў.

Чаму менавіта Французская, а не іншыя буржуазныя рэвалюцыі, зрабілася зыходным пунктам для вылучэння верхняй мяжы ранняга Новага часу?